Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

6. Романова Н.И. Памятники книжной культуры из библиотеки Преосвященного Георгия Конисского (по фондам НББ) // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: зб. навук. арт.: у 2 ч. Мінск, 2006. Ч. 1. С. 90.

7. Там же. С. 90–91.

8. Менгель С. Русские переводы халльских пиетистов: Симеон Тодорский, 1729–1735 // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 9, Филология. 2001. № 3. С. 92.

9. Пиетизм // Большая советская энциклопедия: в 30 т. М., 1975. Т. 19. С. 522.

10. Менгель С. Русские переводы начала XVIII века в Галле – неизвестная попытка на пути создания нового русского литературного языка [Электронный ресурс] // История и диалектология русского языка. URL: http://www.philol.msu.ru/~rlc2001/abstract/files/ist_dial.doc (дата обращения: 21.08.2009).

11. Щукин В.В. Симон (Тодорский), архиепископ Псковский и Нарвский: (биогр. очерк). Псков, 1899. С. 90.

12. Романова Н.И. Указ. соч. С. 91.

13. Буглаков М. Указ. соч. С. 493.

Свякла В.В.

Аб дзейнасці Язэпа Драздовіча па збіранні і апрацоўцы беларускай народна-дыялектнай і тэрміналагічнай лексікі (па дакументах з фондаў ЦНБ НАН Беларусі)

У апошнія дзесяцігоддзі адчувалася відавочная цікавасць навуковай і культурнай супольнасці Беларусі да асобы Язэпа Драздовіча. У навуковай і навукова-папулярнай літаратуры, сродках масавай інфармацыі з’явілася значная колькасць даследаванняў і публікацый, як агульнабіяграфічнага характару, так і прысвечаных асобным бакам таленту нашага славутага суайчынніка. Вядома ж, найбольшую ўвагу прыцягвала і будзе прыцягваць дзейнасць Драздовіча ў напрамку выяўленчага мастацтва. Аднак не абмінаецца ўвагай і Драздовіч-літаратар, Драздовіч-краязнаўца і археолаг, Драздовіч – аўтар прац па касмалогіі... Нярэдка ў рознага роду працах пра Драздовіча ўспамінаецца і яго дзейнасць у якасці збіральніка народнай лексікі. Шматлікія біяграфіі мастака рэдка абыходзяцца без напаміну аб гэтым факце. Аднак звесткі, якія падаюцца ў іх, скупыя і аднатыпныя, лёгка укладваюцца ў рамкі простай фармулёўкі: Язэп Драздовіч збіраў і апрацоўваў для слоўнікаў народную лексіку Дзісеншчыны і Піншчыны. Нярэдка згадваюцца таксама дата, калі мастак займаўся гэтай працай (1926 г.), назвы слоўнікаў, для якіх прызначаўся сабраны матэрыял (найчасцей – «Беларускі этнаграфічны слоўнік»), арганізатар і ідэйны натхняльнік гэтай працы (часцей за ўсё – Беларускае навуковае таварыства ў Вільні, па ініцыятыве якога Драздовіч апынуўся ў камандзіроўцы па Піншчыне, дзе збіраў у ліку іншага і дыялектны матэрыял). Спецыяльных жа прац, прысвечаных гэтаму напрамку дзейнасці мастака (прынамсі такога кшталту, якую выканаў Ю.Малаш [1]), у нашай літаратуры пра Я.Драздовіча няшмат. Мабыць, не ў апошнюю чаргу гэта абумоўлена тым, што Драздовіч-лексікограф не пакінуў пасля сябе аніякай друкаванай спадчыны. Але натуральная з гэтага пункту гледжання недастатковая актыўнасць даследчыкаў у дачыненні да лексікаграфічнай

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

спадчыны Драздовіча выклікае некаторае здзіўленне з улікам таго, што ў розных установах Беларусі і замежжа захоўваецца дастаткова архіўных дакументаў (у т.л. і ўласна лексічнага матэрыялу), што маюць дачыненне да дзейнасці славутага мастака па збіранні народнай лексікі. Звесткі пра гэтыя дакументы можна адшукаць, напрыклад, у працах В.Кіпеля і З.Саўкі [2, с. 448], А.Ліса [3, с. 114], А.Фурса і Я.Кісялёвай [4, с. 51]. Ужо са згаданых крыніц вынікае, што большасць дакументаў такога роду (зрэшты, як і іншых архіўных матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці Драздовіча) захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук (ЦНБ НАН Беларусі) і Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы.

У аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў першай з названых устаноў ненадрукаваныя матэрыялы лексікаграфічнай дзейнасці Драздовіча размяркоўваюцца па фондах наступным чынам. Частка з іх (арыгінальныя рукапісныя дакументы) уваходзіць у склад асабістага рукапіснага архіва мастака, а астатнія (мікрафільмаваныя копіі асобных рукапісаў з фондаў менавіта Бібліятэкі Акадэміі навук Літвы) захоўваюцца ў складзе калекцыі мікрафільмаў. Агульная колькасць адзінак захоўвання, у якія уключаны матэрыялы дзейнасці Драздовіча-лексікографа, невялікая (4 рукапісныя адзінкі захоўвання і 3 мікрафільмы), і гэта дае магчымасць падаць іх поўны пералік у выглядзе табліцы (інфармацыя ў ёй прыводзіцца згодна з бібліяграфічным і навуковым апісаннем адзінак захоўвання, выкананым у ЦНБ НАН Беларусі і паводле іншых крыніц з адпаведнай спасылкай; звесткі, пададзеныя аўтарам, выдзяляюцца знакам < >).

№ п/п	Назва адзінкі захоўвання (адз. зах.)	Дата	Колькасць аркушаў (для рукапісных адз. зах.), кадраў (для мікрафільмаў)
1	Лінгвістычныя матэрыялы (гаворкі Дзісеншчыны і Піншчыны), сабраныя Драздовічам* [5]	1926	88
2	«Беларуска-руская тэрміналёгія па анатоміі і фізыялёгіі цела чалавека» (слоўнік складзены Драздовічам) [6]	б/д <каля 1922>	70
3	«Слоўнікавы матэр’ял з Дзісеншчыны. Літ[ара] “Б”» [7]	б/д <1927>	172
4	«Падрыхтовачны матэр’ял для беларускага слоўніка» [8]	1921 і б/д	40
5	Рукапісы этнаграфічных матэрыялаў Дзісеншчыны. Піншчына [9] (у т.л.: Лінгвістычны матэр’ял да Беларускага Этнаграфічнага Слоўніка. Піншчына [10, с. 448])	б/д /1926/	510
6	Лінгвістычныя матэрыялы да беларускага этнаграфічнага слоўніка (Піншчына) [11]	1926	597

* На самой справе адзінка захоўвання ўключае толькі лексіку, запісаную на Піншчыне.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

7	Рукапісныя матэрыялы. Малюнкі. Беларуская кааператыўная часопіс [12] (У т.л.: Я.Драздовіч. Слоўнік народных тапанімічных тэрмінаў [13, с. 448])	1932 б/д	264 8

З табліцы становіцца зразумелым, што дзейнасць Драздовіча-лексікографа не толькі не абмяжоўвалася запісам дыялектнай лексікі Піншчыны і Дзісеншчыны ў 1926 г., але і ўвогуле выходзіла за межы дыялекталагічнага напрамку. Ды і «Беларускі этнаграфічны слоўнік» – не адзіны лексічны збор, які згадваецца ў загалоўках адзінак захоўвання.

І ўсё ж табліца дае даволі цьмянае ўяўленне аб лексікаграфічнай спадчыне Драздовіча з фондаў ЦНБ НАН Беларусі. Адбываецца гэта таму, што большасць пералічаных адзінак захоўвання складаюцца не з аднаго, а з некалькіх дакументаў, многія з якіх можна разглядаць як адносна самастойную лексікаграфічную адзінку. Унутры адзінкі захоўвання яны могуць не толькі супадаць, але часам і адрознівацца паводле даты ўзнікнення, тэрыторыі, на якой сабраны матэрыял, тыпу слоўніка (дыялекталагічныя і тэрміналагічныя, аднамоўныя і шматмоўныя), формы яго арганізацыі (картатэка, лексічны рэестр, лексічная табліца), парадку размяшчэння слоў (тэматычны або нетэматычны, алфавітны або неалфавітны, гнездавы), спосабаў тлумачэння іх значэння, наяўнасці або адсутнасці звестак пра месца запісу і г.д. У той жа час дакументы, што адносяцца да розных адзінак захоўвання, могуць мець тую ці іншую узаемасувязь. І без уліку гэтых узаемасувязей, без звароту непасрэдна да дакументаў немагчыма даць нават прыблізны адказ на наступныя пытанні: якога роду лексіку запісваў Драздовіч? Якімі прынцыпамі кіраваўся пры яе апрацоўцы? Для якіх слоўнікавых збораў прызначалася гэтая праца? Які агульны аб’ём зафіксаванага матэрыялу? У якой якасці Драздовіч дачыніўся да стварэння таго ці іншага словазбору? Атрымаць адказ на іх важна не толькі для рознага роду даследаванняў, але і для удакладнення і дапаўнення наяўных бібліяграфічных і навуковых апісанняў гэтых дакументаў.

Нават павярхоўнага погляду на лексікаграфічную спадчыну мастака з фондаў ЦНБ НАН Беларусі дастаткова, каб заўважыць, што акрамя збірання для слоўнікаў народна-дыялектнай лексікі, дзейнасць Драздовіча-лексікографа мела яшчэ адзін кірунак: запіс і апрацоўка тэрміналагічнай лексікі з мэтаю стварэння тэрміналагічных слоўнікаў. Абодва гэтыя кірункі маюць выразнае часавае размежаванне: тэрміналагічная дзейнасць Драздовіча адносіцца да 1921–1922 гг. і апярэджвае этап збірання народна-дыялектнай лексікі на пяць год. Таму агляд лексікаграфічнай спадчыны мастака з фондаў бібліятэкі мэтазгодна распачаць менавіта са слоўнікавых запісаў тэрміналагічнага характару. (табл. № 2, 4, 7).

Аднак, гаворачы пра тэрміналагічны напрамак дзейнасці Драздовіча-лексікографа, неабходна улічваць наступныя акалічнасці.

Па-першае, тыя лексічныя зборы, якія сам Драздовіч пазначае як тэрміналагічныя, у сённяшнім разуменні не з’яўляюцца такімі ў поўнай меры, галоўным чынам з-за таго, што ў іх уключана не толькі, і нават не столькі,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

вузкаспецыяльная, колькі агульнаўжывальная лексіка пэўнай тэматыкі. Сучасная лінгвістычная навука ахарактарызавала б гэты слоўнікавы матэрыял як зборы тэматычнай лексікі альбо лексіка-семантычныя зборы. Таму у далейшым тэксце словы «тэрміналогія», «тэрміналагічны» і падобныя належыць ўспрымаць з доляю ўмоўнасці.

Па-другое, групоўка лексікі паводле семантыкі уласцівая не толькі тэрміналагічным, але і некаторым дыялектным словазборам Драздовіча, аб чым будзе сказана ніжэй.

Агляд запісаў беларускай тэрміналогіі, выкананых Драздовічам, адкрывае «Падрыхтовачны матэр'ял для беларускага слоўніка» (табл. № 4). Гэта зборная назва, прысвоеная пры навуковай апрацоўцы архіва мастака групе дакументаў, якія ўяўляюць сабою запісы беларускай лексікі, згрупаванай пераважна ў адпаведнасці з лексіка-семантычным прынцыпам. Дастатковых падстаў сцвярджаць, што ў планы Драздовіча ўваходзіла ўключэнне ўсёй гэтай лексікі ў адзін політэматычны слоўнік, няма, таму мэтазгодна казаць пра матэрыял для асобных тэматычных слоўнікаў: «Падрыхтовачны матэр'ял для беларускага слоўніка па географіі і геалогіі», «Матэр'ял да бел[арускага] слоўніка: батаніка і аграномія», «Матэр'ял для беларускага слоўніка па псыхалёгіі: характэрызацыя дарэчнасьці і адрэчнасьці людзей». Побач з гэтымі дакументамі склад адзінкі захоўвання ўключае слоўнічкі назваў «хатніх рэчаў», абазначэнняў свойскіх жывёл паводле розных прыкмет, гукаперайманняў, а таксама алфавітны спіс нетэматычнай лексікі. Амаль увесь гэты лексічны матэрыял (акрамя слоўніка па батаніцы і аграноміі) выкладзены ў выглядзе простых слоўнікавых рэестраў, без апісання значэння слоў.

Па большасці фармальных прыкмет блізкі да слоўнікавых запісаў, што увайшлі у групу дакументаў з агульнай назвай «Падрыхтовачны матэр'ял для беларускага слоўніка», слоўнік народных тапанімічных тэрмінаў (табл. № 7), як характарызуюць яго В.Кіпель і З.Саўка [14] (фактычна – рэестр пераважна агульнаўжывальнай лексікі з геаграфічнай і тапаграфічнай семантыкай).

Калі пералічаныя лексічныя запісы, магчыма, з'яўляюцца часткамі аднаго і таго ж слоўніка, то наступная тэрміналагічная праца Драздовіча – «Беларуска-руская тэрміналёгія па анатоміі і фізыялёгіі цела чалавека» – несумненна самастойная лексікаграфічная адзінка. Прынцыповае яго адрозненне ад папярэдніх тэрміналагічных збораў у тым, што гэта – перакладны слоўнік. Ён складаецца з 10 раздзелаў, кожны з якіх аб'ядноўвае лексіку, што абазначае тыя ці іншыя часткі цела ці органы: «Павярхоўныя формы чалавечага цела»; «Косці»; «Мазгі і нервы», «Крывазварот» і інш.; раздзелы, у сваю чаргу, маюць падраздзелы. Унутры падзраздзелаў Драздовіч адмаўляецца ад алфавітнага парадку, затое паслядоўна групуе лексіку ў словаўтваральныя гнёзды. Характэрнай рысай слоўніка з'яўляецца наяўнасць вялікай колькасці састаўных тэрмінаў (тэрмінаў-словазлучэнняў). Пра дату яго стварэння можна меркаваць з ліста А.Луцкевіча да Я.Драздовіча з просьбай аб высылцы рукапіса слоўніка на адрас Беларускага навуковага таварыства ў Вільні ад 15 студзеня 1922 г. [15, л. 3].

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Запісы дыялектнай лексікі, зробленыя Драздовічам, увайшлі ў склад чатырох адзінак захоўвання (табл. №№ 1, 3, 5, 6). У іх загалоўках фігуруе інфармацыя, абсалютна сугучная той, што падаецца ў большасці крыніц у дачыненні да дзейнасці Драздовіча па збіранні народна-дыялектнай лексікі: дата дакументаў – 1926 –1927 гг., геаграфічны арэал, на якім ажыццяўляліся запісы, – Піншчына і Дзісеншчына, лексічны збор, для якога прызначаўся лексічны матэрыял – «Беларускі этнаграфічны слоўнік».

Аднак далёка не відавочным выглядае той факт, што ўвесь гэты матэрыял прызначаўся для «Беларускага этнаграфічнага слоўніка». Лексічныя запісы, зробленыя Драздовічам на Піншчыне і Дзісеншчыне, увогуле неаднародныя паводле спосабаў сваёй арганізацыі і апісання значэння слоў. У адпаведнасці з гэтым іх можна падзяліць на 3 групы:

1) картатэка нетэматычнай лексікі Піншчыны (табл. № 6). Толькі гэты слоўнікавы матэрыял, датаваны 29 кастрычніка 1926 г., мае ўказанне на прыналежнасць да «Беларускага этнаграфічнага слоўніка» у выглядзе надпісу адпаведнага зместу, зробленага самім збіральнікам;

2) запісы народнай лексікі Піншчыны, згрупаваныя ў адпаведнасці з лексіка-семантычным прынцыпам (табл. №№ 1, 5): назвы жывёл, назвы частак цела і органаў жывёл і чалавека, словы, якімі прываблівающь або адганяюць жывёлу, назвы хатне-гаспадарчых рэчаў Піншчыны. Дарэчы, у гэтым і заключаецца падабенства паміж «тэрміналагічнымі» і «дыялекталагічнымі» запісамі Драздовіча, пра якое гаварылася вышэй;

3) картатэкі нетэматычнай народнай лексікі Дзісеншчыны (табл. №№ 3, 5).

Як бачна, лексічныя запісы першай і другой груп маюць агульны арэал (без сумнення, і тыя, і іншыя зроблены падчас згаданай этнаграфічнай экспедыцыі 1926 г.), але не супадаюць паводле прынцыпу групоўкі слоў. Паводле яго, блізкія паміж сабою першая і трэцяя групы, але іх адрознівае, акрамя месца запісу, невялікае храналагічнае разыходжанне (частка лексікі Дзісеншчыны была запісана ў 1927 г., на што ўказвае сам збіральнік [16, л. 117]), і, што больш істотна, значнае непадабенства ў спосабах тлумачэння слоў. Ва усіх сваіх дыялектных зборах Драздовіч у той ці іншай ступені выкарыстоўвае для апісання семантыкі слоў пераклад на рускую мову, падбор агульнаўжывальнага беларускага сіноніма, дэфініцыю. Але калі ў картатэцы нетэматычнай лексікі Піншчыны першы з названых спосабаў з'яўляецца абавязковым, то для запісаў, зробленых на Дзісеншчыне, ён становіцца дапаможным, нерэгулярным, а на першае месца выходзяць сінанімічны спосаб і дэфініцыя (дарэчы, як і ў запісах тэматычнай лексікі Піншчыны, але ў адрозненне ад іх картатэкі з Дзісеншчыны маюць яшчэ і прыклады ўжывання слоў). А вось назва населенага пункта, у якім занатавана тое ці іншае слова, наадварот, прысутнічае толькі ў запісах, зробленых на Піншчыне.

Зразумела, нават пры такой колькасці адрозненняў нельга рабіць выснову, што дыялектызмы, сабраныя Драздовічам, прызначаліся для розных словазбораў (прынцыпы апрацоўкі лексікі для слоўніка маглі быць

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

недастаткова дакладна сфармуляванымі, з цягам часу мэтанакіравана змяняцца, несвядома парушацца і г.д.), але недастаткова і падстаў сцвярджаць адваротнае.

А вось тое, што азначаная лексіка збіралася для Беларускага навуковага таварыства ў Вільні, не выклікае аніякага сумнення. Прамым сведчаннем гэтага з'яўляюцца адзнакі адпаведнага зместу, зробленыя мастаком на некаторых запісах рэгіянальнай лексікі з яго асабістага архіва (гл., напрыклад, [17, л. 147]), а ўскосным – тое, што арыгіналы дакументаў, з якіх рабіліся мікрафільмаваныя копіі дыялекталагічнага матэрыялу для ЦНБ НАН Беларусі, у Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы уваходзяць у склад архіўнага фонду № 2 (ён, як сцвярджае А.Ліс, «сфарміраваны на базе архіўных матэрыялаў былога Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча» [18, с. 122], што дзейнічаў пры гэтым таварыстве).

Выклікае некаторую цікавасць і пытанне аб лексічным аб'ёме сабранага Драздовічам матэрыялу. Аднак у лексічных спісах і табліцах (табл., адз. зах. №№ 1, 2, 4, 7) падлікі колькасці слоў не праводзіліся, па-першае, з-за працаёмкасці такой аперацыі, а па-другое, таму, што выкананне гэтай калькуляцыі у большай ступені належыць да сферы дзейнасці не бібліятэк, а спецыялістаў-мовазнаўцаў і іншых даследчыкаў. Што да падліку картак у картатэках (табл., адз. зах. №№ 3, 5, 6), то на аснове іх нумарацыі або падлікаў, зробленых Драздовічам, устаноўлена, што агульны аб'ём лексікі Піншчыны ў іх складае каля 710 слоў, з якіх 390 – нетэматычная лексіка (гл. таксама [19]), і каля 420 – тэматычная. Картатэкі лексікі Дзісеншчыны маюць аб'ём каля 660 слоў. Больш дакладныя падлікі, бадай, мэтазгодна было б выканаць з улікам дублявання лексічных адзінак у розных словазборах.

Адказаць на пытанне аб тым, у якой якасці Драздовіч дачыніўся да таго ці іншга слоўнікавага збору (аўтар, складальнік ці проста збіральнік лексікі для калектыўнай працы), аналізуючы толькі лексічны матэрыял, практычна немагчыма. Больш звестак пра гэта даюць іншыя крыніцы, у т.л. экстралінгвістычнага характару (напрыклад, некаторыя падставы прылічыць «Беларуска-рускую тэрміналёгію па анатоміі і фізыялёгіі цела чалавека» да аўтарскіх прац Драздовіча дае змест згаданага вышэй ліста А.Луцкевіча). Але, паколькі такога роду дакументы засталіся ў асноўным па-за межамі зробленага даследавання, то і пытанне не атрымала адказу.

Падсумоўваючы сказанае, заўважым: Язэп Драздовіч, хоць і не ўвайшоў у гісторыю як складальнік таго ці іншага слоўніка, але ўсё ж пакінуў немалую лексікаграфічную спадчыну. Вынікі яго працы – гэта даволі аб'ёмістыя зборы беларускай лексікі: як народна-дыялектнай, так і тэрміналагічнай. Зробленая тут спроба даследавання рукапісных слоўнікавых збораў мастака, хоць і ахоплівае значную іх частку, але пакідае без адказу шэраг звязаных з імі пытанняў. Каб адказаць на іх, неабходна, па-першае, вывучэнне не толькі лексікаграфічнай спадчыны, што пакінуў нашчадкам Драздовіч, але і іншых дакументаў, звязаных з гэтым напрамкам яго дзейнасці. Па-другое, не абыйсціся без удзелу ў даследаваннях прадстаўнікоў самых розных навук і сфер дзейнасці. І, нарэшце, нельга абмяжоўвацца ў гэтай справе даследаваннем фондаў асобна ўзятай бібліятэкі – якімі б багатымі і каштоўнымі яны ні былі.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

1. Малаш Ю. Мастацка-этнаграфічная, лінгвістычная калекцыя Язэпа Драздовіча з Піншчыны, 1926 г. // Народнае дойлідства Беларусі: праблемы захавання, выкарыстання і інтэрпрэтацыі: матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 27-28 верас. Мінск, 2007. С. 154–159.
2. Беларускія слоўнікі й энцыкляпэдыі: бібліяграфія / склад.: В.Кіпель, З.Саўка. Нью Ёрк; Менск, [2002]. 568, [2] с.
3. Ліс А. Матэрыялы Віленскага Беларускага фонду // Выяўленне, сумеснае выкарыстанне і вяртанне архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў замежных краінах. Мінск, 1999. С. 112–123.
4. Фурс А., Кісялёва Я. Рукапісная спадчына Я.Драздовіча ў сховішчах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі АН Беларусі // Язэп Драздовіч – асоба, творчасць. Мастацтва-інсітус: матэрыялы навук.-практ. канф. Мінск, 1997. С. 50–51.
5. ЦНБ НАН Беларусі, аддз. рэд. кніг і рукапісаў. Ф. 2. Адз. зах. 27.
6. ЦНБ НАН Беларусі, аддз. рэд. кніг і рукапісаў. Ф. 2. Адз. зах. 29.
7. ЦНБ НАН Беларусі, аддз. рэд. кніг і рукапісаў. Ф. 2. Адз. зах. 30.
8. ЦНБ НАН Беларусі, аддз. рэд. кніг і рукапісаў. Ф. 2. Адз. зах. 31.
9. Драздовіч Я. Рукапісы этнаграфічных матэрыялаў Дзісеншчыны. Піншчына [Мікрафільм]. [Б. д.]. 510 кадраў.
10. Беларускія слоўнікі й энцыкляпэдыі …
11. Драздовіч Я. Лінгвістычныя матэрыялы да беларускага этнаграфічнага слоўніка (Піншчына) [Мікрафільм]. 1926. 577 кадраў.
12. Драздовіч Я. Рукапісныя матэрыялы. Малюнкі. Беларуская кааператыўная часопісь [Мікрафільм]. 1932. 264 кадры
13. Беларускія слоўнікі й энцыкляпэдыі …
14. Там жа. С. 448.
15. ЦНБ НАН Беларусі, аддз. рэд. кніг і рукапісаў. Ф. 2. Адз. зах. 44. Л. 3.
16. ЦНБ НАН Беларусі, аддз. рэд. кніг і рукапісаў. Ф. 2. Адз. зах. 30. Л. 117.
17. ЦНБ НАН Беларусі, аддз. рэд. кніг і рукапісаў. Ф. 2. Адз. зах. 30. Л. 147.
18. Ліс А. Пазнач. твор. С. 112–123.
19. Беларускія слоўнікі й энцыкляпэдыі … С. 448.

Белы А.В.

Да пытання аб датаванні Псалтыра з паследаваннем («Псалтирь с восследованием») з друкарні Мамонічаў: філіграналагічны аналіз

Друкарня Мамонічаў пачала працаваць у 1574 г. і праіснавала ў Вільні амаль 50 гадоў з перапынкамі, а апошнія выданні выйшлі ў 1623 г. Найвыдатнейшымі са знешняга выгляду былі яе выданні пачатковага перыяду, калі ў друкарні працаваў Пётр Мсціславец (1574–1576 гг.). Больш познія выданні Мамонічаў амаль не маюць арыгінальнага гравіраванага арнаменту. Як арнаменты, так і гравюры-выявы ў выданнях паўтараюць больш раннія ўзоры Мсціслаўца і Івана Фёдарава. Фінансавую падтрымку Мамонічам аказвалі праваслаўныя шляхцічы Зарэцкія. Пры падтрымцы Льва Сапегі ў 1586 і 1593 гадах Мамонічы атрымалі прывілеі, што часова дазволіла ім манапалізаваць выданне кніг на старабеларускай і царкоўнаславянскай мовах. Большая частка выданняў друкарні ў XVI ст. прызначалася на патрэбы праваслаўнай царквы, брацтваў, іх школ. Але пасля Берасцейскай уніі 1596 г. і пасля таго, як друкарню ў 1601 г. ўзначаліў Леон Мамоніч, друкаванне для праваслаўнай царквы стала сутыкацца з пэўнымі складанасцямі.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by